# Міністр ажыццявіў рабочую паездку ў Маладзечна

Сёння, 6 жніўня, Міністр сувязі і інфарматызацыі Канстанцін Шульган ажыццявіў рабочую паездку ў Маладзечна.

Правёў сустрэчу з працоўнымі калектывамі Маладзечанскага рэгіянальнага вузла паштовай сувязі, Маладзечанскага занальнага вузла паштовай сувязі і Маладзечанскага ўчастка ААТ «Мінсктэлекамбуд».

У межах сустрэчы кіраўнік Мінсувязі праінфармаваў аб ходзе выканання даведзеных паказчыкаў сацыяльна-эканамічнага развіцця ў цэлым па Мінсувязі, абмеркаваў з удзельнікамі далейшыя перспектыўныя напрамкі работы ў сферы дзейнасці інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій і адказаў на пытанні, цікавыя прысутным работнікам.

Наведаў аддзяленне паштовай сувязі г. Маладзечна і азнаёміўся з арганізацыяй працы работнікаў.

Варта адзначыць, што на тэрыторыі як раёна, так і горада забяспечваецца выкананне ўстаноўленых нарматываў дзяржаўных сацыяльных стандартаў па абслугоўванню насельніцтва ў галіне сувязі:

- заявы на ўстаноўку тэлефона з тэрмінам задавальнення больш за 1 год адсутнічаюць;
- забяспечана магчымасць аказання паслуг шырокапалоснага доступу ў сетку Інтэрнэт у кожным населеным пункце з насельніцтвам 300 жыхароў і вышэй;
- тэлефанізаваныя ўсе пункты аховы здароўя, у тым ліку ў аграгарадках;
- дастаўка пошты ажыццяўляецца 1 раз у дзень не менш за 5 дзён у тыдзень.

*Маладзечанскі рэгіянальны вузел паштовай сувязі з'яўляецца структурным падраздзяленнем Мінскага філіяла РУП «Белпошта» ў склад якога ўваходзіць Валожынскі ўчастак паштовай сувязі.*
*Работнікамі Маладзечанскага РВПС абслугоўваюцца каля 700 населеных пунктаў з колькасцю насельніцтва больш за 167 тыс. чалавек.*
*У склад Маладзечанскага ЗВЭС ўваходзяць: Вілейскі, Валожынскі і Мядзельскі вузлы электрасувязі.*

**Source URL:** *https://mpt.gov.by/news/06-08-2020-6651*